# Свята фальклору для мінчан

Багатым на абмеркаванні круглым сталом і канцэртам лепшых выканаўцаў 13 лістапада быў прэзентаваны рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня" ў мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў. Намеснік міністра культуры Беларусі Тадэвуш Стружэцкі паведаміў, што многія айчынныя фестывалі, якія праводзяцца ў аддаленых рэгіёнах краіны, будуць прадстаўлены сталічным жыхарам, а "Берагіня" — адзін з найлепшых па адлюстраванні традыцыйнай культуры беларусаў.

Ці можна непрымусова далучаць дзяцей да фальклору? Над такім пытаннем разважалі ўдзельнікі круглага стала пад назвай "Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання, аднаўлення і трансляцыі". Акрамя спецыялістаў з некалькіх інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, абласных метадычных цэнтраў, работнікаў устаноў адукацыі ў дыскусію ўступілі кіраўнікі дзіцячых фальклорных калектываў і нават выхавальнікі дзіцячых садкоў. Усе яны зацікаўлены ў тым, каб далучэнне дзяцей да традыцый адбывалася ў самым малым узросце, каб гэтаму спрыялі садок, школа, гурткі. Вывучаць фальклор трэба з задавальненнем.

Працаваць комплексна, не перарываць працэс адукацыі і культурнага ўзбагачэння дзяцей і моладзі, удасканальваць сумеснымі намаганнямі не толькі фестываль "Берагіня", але і ўсю сістэму трансляцыі фальклору ў краіне — такія задачы абазначылі сабе ўдзельнікі дыскусіі.

Канцэрт дзіцячых і дарослых аўтэнтычных выканаўцаў адбыўся з аншлагам. Публіка адзначыла гучнымі апладысментамі фальклорны гурт "Верас" Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі і ансамбль "Калыханка" Міханавіцкага дома фальклору Мінскага раёна. Конкурс танцавальных пар, у якім удзельнічалі школьнікі з Акцябрскага, Полацкага раёнаў і Мінска, таксама прыцягнуў увагу гледачоў. Песні, танцы, найгрышы, народную прозу паказалі дзеці з усіх рэгіёнаў Беларусі.

**Наталля ЗУБАВА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ